**ВЫПУСКНЫ БАЛЬ – 2022**
Рэктарскі баль стаў трайным святам для выпускнікоў, іх бацькоў, выкладчыкаў і адміністрацыі БДУ
Стар. 1, 3

**РАБІЦЬ ЛЮДЗЕЙ ШЧАСЛІВЕЙШЫМІ**
Інтэрв'ю з прафесарам Віктарам Іванавічам Іўчанкавым
Стар. 2

**КРЫЖ ДЛЯ КАПЛІЦЫ БДУ**
Універсітэту перадалі рэпліку крыжа Ефрасінні Полацкай
Стар. 4 – 5

**КІНО НА ПРЫРОДЗЕ**
Турзлёт «Высокі бераг – 2022» праходзіў у кінематаграфічнай тэматыцы
Стар. 8

Газета Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
www.gazeta.bsu.by

# УНІВЕРСІТЭТ

*Пераможца V і XV Нацыянальных конкурсаў друкаваных СМІ «Залатая літара» ў намінацыях «Найлепшая шматтыражная газета», «Найлепшыя матэрыялы навуковай, навукова-папулярнай тэматыкі»*

1 ліпеня 2022 года, № 9 (2260)

# Міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў – ганаровы прафесар БДУ




1 ліпеня міністр замежных спраў Расійскай Федэрацыі Сяргей Лаўроў быў узнагароджаны высокім званнем – ганаровы прафесар БДУ. Цырымонія адбылася на сустрэчы вядомага расійскага дыпламата з беларускім студэнцтвам.

Як адзначыў рэктар БДУ Андрэй Кароль, прысваенне звання – гэта сведчанне вялікага асабістага ўкладу ва ўмацаванне і развіццё ўсебаковых сяброўскіх адносін паміж Расіяй і Беларуссю. Візіт у БДУ расійскага дыпламата трэці па ліку. Міністр замежных спраў Расіі выступаў з тэматычнымі лекцыямі для ўніверсітэцкай моладзі ў 2007 і 2016 гадах.

– Наведванне БДУ мае асаблівае значэнне ў трыццатую гадавіну ўсталявання дыпламатычных адносін паміж Расіяй і Беларуссю. БДУ захаваў і прымножыў адукацыйныя, навуковыя сувязі з вядучымі ўніверсітэтамі Расійскай Федэрацыі, з якімі ў нас падпісана больш за 150 пагадненняў, – падкрэсліў Андрэй Кароль.

Падчас візіту кіраўнік расійскага знешнепалітычнага ведамства ўшанаваў памяць загінулых у гады Вялікай Айчыннай вайны студэнтаў і выкладчыкаў БДУ, усклаў кветкі да мемарыяльнага знака «Стэла памяці» ва ўніверсітэцкім дворыку.

**Паводле інфармацыі прэс-службы БДУ**



# Выпускны баль – 2022: у сценах БДУ адзначылі трайное свята

**Рэктарскі баль у БДУ, які прайшоў 23 чэрвеня, стаў трайным святам для выпускнікоў і іх бацькоў, выкладчыкаў і адміністрацыі ўніверсітэта, адзначыў рэктар Андрэй Дзмітрыевіч Кароль. Гэта не толькі імпрэза ў гонар заканчэння чатырох- і пяцігадовай вучобы, нялёгкіх сесій, прафесійнага пошуку, але яшчэ і доўгачаканае свята пасля зацяжных абмежаванняў пандэміі і выдатная нагода сабрацца вялікай дружнай універсітэцкай сям'ёй у абноўленым унутраным дворыку.**



Па традыцыі на выпускны баль прыбылі найлепшыя з лепшых: выдатнікі ў вучобе, актывісты, маладыя навукоўцы, будучыя зоркі, валанцёры, спартсмены, прызёры алімпіяд і конкурсаў міжнароднага і рэспубліканскага ўзроўню. Кожны з тых, хто атрымаў запрашэнне на гэтае свята, – гонар БДУ. Цёпла, па-хатняму, з усмешкай і лёгкім сумам выпускнікоў сустракалі выкладчыкі, дэканы, прарэктары.

З прывітальным словам да гасцей балю звярнуўся рэктар БДУ Андрэй Кароль. «Я б хацеў звярнуцца да вас, дарагія выпускнікі, і пажадаць, каб слова "ўнутраны" вы беражліва неслі праз усё жыццё. Не вялікі сакрэт, што ўсе мудрасці, усе шчаслівыя імгненні жыцця чалавек нараджае сам. Гэта ўнутры яго знаходзіцца, як і магчымасць задаць пытанне ў патрэбны час і атрымаць на яго патрэбны адказ. Атрымаць яго не звонку, а ўнутры сябе. Гэта значна больш каштоўна, чым знайсці інфармацыю дзе б там ні было. І тыя цяжкасці, якія сустракаюцца на шляху, павінны ўспрымацца як пэўны навучальны элемент. Вучоба не заканчваецца для вас зараз, у чэрвені 2022 года, а па сутнасці, пачынаецца яе новы этап. Вельмі важна, каб той сусвет, які заключаны ўнутры кожнага з вас, заўсёды прынесіў вам тыя пачуцці роўнасці, задавальнення і карысці, якія з'яўляюцца вельмі важнымі ў нашым вельмі нестабільным свеце», – пажадаў ён.

З глыбокай падзякай звярнуўся рэктар і да бацькоў выпускнікоў, якія выхоўвалі, уплывалі на выбар ВНУ і шлях прафесійнага развіцця сваіх дзяцей. Звярнуў увагу Андрэй Дзмітрыевіч і на плённую працу выкладчыкаў, якія ўклалі ў кожнага таленавітага выпускніка часцінку сябе. Таксама ён адзначыў, што ва ўніверсітэце заўсёды будуць рады бачыць кожнага, хто захоча вярнуцца ў БДУ – свой родны дом.

– Галоўнае памятаць, што званне выпускнік БДУ – гэта не толькі вялікая прывілея, але і каласальная адказнасць.Са святам, дарагія выпускнікі! Добрых вам спадарожных вятроў у жыцці і, вядома ж, святочнага настрою, – такімі словамі рэктар адкрыў выпускны баль.

Пасля гэтага Андрэй Дзмітрыевіч уручыў дыпломы і маленькія памятныя статуэткі студэнтам. Далей узнагароды з рук прарэктараў атрымалі тыя, каго звычайна ў сценах універсітэта і нават за яго межамі добра ведаюць. На сцэну запрасілі «студэнцкіх лідараў»: прызёраў універсіяд па розных відах спорту, кіраўнікоў і актыўных прадстаўнікоў студэнцкіх арганізацый і аб'яднанняў.

Дэканы факультэтаў узнагародзілі «зорак БДУ»: удзельнікаў канферэнцый, конкурсаў талентаў, грамадскіх праектаў.

Музычныя віншаванні выпускнікам з імправізаванай сцэны адрасавалі Самвэл, Улад Чыжыкаў, Вераніка Цубікава, Андрэй Усанаў і іншыя выканаўцы.

Афіцыйная ўрачыстая частка святочнага вечара завяршылася вальсам, які станцавалі рэктар Андрэй Кароль і найлепшая выпускніца факультэта міжнародных адносін у намінацыі «Зорка БДУ» Караліна Бурунава. Але на гэтай ноце свята не скончылася.

*Працяг на старонцы 3*

УНІВЕРСІТЭТ
1 ліпеня 2022 года, № 9 (2260)

# БДУ і РАА: агульныя праблемы ў педагогіцы нас аб'ядноўваюць

Рэктар БДУ Андрэй Кароль і прэзідэнт Расійскай акадэміі адукацыі (РАА) Вольга Васільева падпісалі мемарандум аб паразуменні 14 чэрвеня.



Мемарандум аб узаемаразуменні паміж Беларускім дзяржаўным універсітэтам і Расійскай акадэміяй адукацыі падпісалі 14 чэрвеня рэктар БДУ Андрэй Кароль і прэзідэнт РАА Вольга Васільева. Цырымоніі папярэднічала сустрэча кіраўнікоў, падчас якой былі дэталёва разгледжаны перспектыўныя напрамкі для сумеснага развіцця сістэм вышэйшай адукацыі Беларусі і Расіі. Гэта праца пазначана прыярытэтнай у галіне навуковых і адукацыйных праектаў, абмену інфармацыяй і вопытам, узаемнага ўдзелу ў навуковых мерапрыемствах, правядзення канферэнцый, семінараў і сімпозіумаў.

Прадметным стала абмеркаванне стварэння навукова-метадалагічнага савета па якасці вышэйшай адукацыі. Сёння ёсць патрэба навуковага падыходу ў метадалагічным забеспячэнні вышэйшай адукацыі і падрыхтоўкі спецыялістаў. РАА ў дадзеным кірунку мае вялікі вопыт: навукоўцы акадэміі актыўна праводзяць даследаванні ўсіх узроўняў расійскай сістэмы, распрацоўваюць новыя падыходы ў навучанні з улікам патрабаванняў эканомікі, запытаў грамадства, сацыяльна-эканамічных зменаў, выклікаў, нацыянальных традыцый і замежнага досведу.

Найбліжэйшай перспектывай можа стаць адкрыццё сумеснай сеткавай магістарскай праграмы ў БДУ. Узаемадзеянне для яе рэалізацыі магчымае праз прыцягненне навукоўцаў РАА да распрацоўкі зместу вучэбнай праграмы, чытанне лекцый і правядзенне практычных заняткаў.

Каментуючы важнасць падпісанага дакумента, рэктар Андрэй Кароль адзначыў, што сёння пытанне падрыхтоўкі спецыялістаў Саюзнай дзяржавы стаіць як ніколі востра. «БДУ абапіраецца на моцныя традыцыі ў адносінах да самой якасці адукацыі. І ў той жа час, класічны ўніверсітэт - гэта інтэлектуальнае асяроддзе, здольнае прапанаваць новы падыход да праектавання і рэалізацыі вышэйшай адукацыі ў XXI стагоддзі. Для гэтага будзе каштоўным вопыт РАА і ўзаемадзеянне з навукоўцамі і даследчыкамі», – адзначыў рэктар.

Падчас візіту Вольга Васільева сустрэлася са студэнтамі і выкладчыкамі БДУ. Свой візіт у БДУ яна звязала з вялікім навуковым патэнцыялам беларускай ВНУ ў галіне адукацыі. Універсітэт, са слоў спікера, з'яўляецца вельмі магутным навуковым цэнтрам сусветнага маштабу. «Многія адукацыйныя пытанні, якія вырашае сёння БДУ, актуальныя і для нашай акадэміі. Перш за ўсё, дыдактыка ў перыяд лічбавай трансфармацыі, выхаванне моладзі. Выхаванне – гэта вялікая навука, звязаная з кагнітыўнымі даследаваннямі, якія цяпер у прыярытэце ва ўсіх краінах», – канкрэтызавала Вольга Васільева.

Ганаровая госця распавяла пра сучасную метадалогію і практыку ўніверсітэцкай адукацыі ў кантэксце новых выклікаў. У сваю чаргу студэнтаў хвалявалі пытанні выхаду з Балонскай сістэмы беларускіх і расійскіх ВНУ, сумесныя адукацыйныя праекты БДУ і РАА, прыцягнення моладзі да міжкультурнага і міжнацыянальнага ўзаемадзеяння. Вольга Васільева падзялілася таксама меркаваннем пра фарміраванне адзінай адукацыйнай сістэмы ў рамках Саюзнай дзяржавы, краін ЕАЭС, СНД, захаванне гістарычнай памяці, перспектывы развіцця адукацыйнай сістэмы на постсавецкай прасторы, аднаўленне акадэмічнага дыялогу паміж гісторыкамі славянскіх краін.

У кнізе ганаровых гасцей БДУ прэзідэнт РАА пакінула цёплыя словы пра наведванне БДУ і выказала спадзяванне на эфектыўнасць супрацоўніцтва для ўмацавання адукацыйных сувязяў дзвюх краін.

У знак прызнання асабістага ўкладу ва ўмацаванне партнёрскіх адносін з беларускай ВНУ Вользе Васільевай быў уручаны нагрудны знак «100 гадоў БДУ».

*Васільева Вольга Юр'еўна – доктар гістарычных навук, прафесар, акадэмік і прэзідэнт Расійскай акадэміі адукацыі.*

*Сферу навуковых інтарэсаў складаюць: метадалогія і тэхналогія выкладання навучальнага курса «Асновы рэлігійных культур і свецкай этыкі» ў расійскай сістэме адукацыі; цэласная сістэма зместу навучальнага курса асноў рэлігійных культур і свецкай этыкі; падыходы да пабудовы навукова-даследчай прасторы па вывучэнні гісторыі рэлігій і гісторыі дзяржаўна-канфесійных адносін у Расійскай Федэрацыі.*

*З 2016 па 2018 год – міністр адукацыі і навукі Расіі, з 2018 па 2020 год – міністр асветы Расіі. Уваходзіць у склад апякунскага савета фонду «Гісторыя Айчыны», член Міжнароднай асацыяцыі гісторыі рэлігій, ганаровы член Міжнароднага астранамічнага саюза.*

*РАА – пераемніца Акадэміі педагагічных навук РСФСР (з 1966 года – СССР). На яе базе на працягу першай паловы 1992 г. і была створана Расійская акадэмія адукацыі. У савецкі час у склад акадэміі ўваходзіла 20 навукова-даследчых інстытутаў (частка з іх з філіяламі). У кіраванні акадэміі знаходзілася 17 эксперыментальных навучальных устаноў (звыш 11 тысяч навучэнцаў і каля 1000 настаўнікаў).*

**Алена МАРЦУЛЕВІЧ**



*Пачатак на старонцы 1*

# Выпускны баль – 2022:
## ў сценах БДУ адзначылі трайное свята



**Максім Грыц, эканамфак, «Найлепшы выпускнік БДУ».** Стыпендыят спецыяльнага фонду Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па сацыяльнай падтрымцы адораных навучэнцаў і студэнтаў (2021); старшыня студэнцкага савета па якасці адукацыі і навуцы эканамічнага факультэта (2020–2022); уладальнік падзякі БДУ за актыўны ўдзел у грамадскім жыцці ўніверсітэта. Занесены на дошку гонару БДУ (2021).

– Для мяне ўніверсітэт – гэта вельмі важныя 4 гады майго жыцця. Я б нават сказаў, што гэта менавіта тыя людзі, якія тут прысутнічаюць. Я ўпэўнены ва ўніверсітэце, узроўні падрыхтоўкі студэнтаў і выхаванні асобаў. БДУ робяць людзі. Таму я хачу пажадаць універсітэту цудоўных людзей для развіцця ва ўсіх напрамках.



**Арына Анісава, філфак, «Зорка БДУ».** Пераможца і ўладальніца прыза сімпатый гледачоў фестывалю эстрады БДУ ў намінацыі «Канферанс» (2021); пераможца ў намінацыі «Вядучы года» прэміі Творчага саюза БДУ па выніках 2020 года; пераможца праекта «Курсы вядучых БДУ»; удзельніца праекта па распрацоўцы карпаратыўнага календара БДУ на 2022 год.

– У першую чаргу хацела б сказаць, што неверагодна люблю БДУ і студэнцкія гады. Наперадзе ўсё самае лепшае, але толькі дзякуючы ўніверсітэту, тым пяці гадам, той студэнцкай арганізацыі, у якой працавала, я сустрэла неверагодных людзей, сяброў, і, не пабаюся таго слова, сям'ю, з якой іду разам па жыцці. Таму з вялікай любоўю, павагай і падзякай стаўлюся да нашага ўніверсітэта. І такое адчуванне, што буду крыху сумаваць. А можа, і не крыху.



**Кацярына Жук, філфак, «Найлепшы выпускнік БДУ».** Кіраўнік харэаграфічнага напрамку Творчага саюза БДУ (2019–2022); удзельніца праекта па распрацоўцы карпаратыўнага календара БДУ (2022); член каманды КВН БДУ «Прахадная» (з 2019); харэограф Студэнцкага балю БДУ (2019, 2021).

– Пакуль не верыцца, што мы выпусціліся. Да гэтага выпускнога балю было прыемнае хваляванне, а зараз гляджу на ўсіх сваіх знаёмых і сяброў, якія разам са мной выпускаюцца, і адчуваю, што яны сталі за столькі гадоў нібыта роднымі. І спадзяюся, што яны застануцца побач.



**Мэнлі Маметназарава, ФФСН, «Найлепшы выпускнік».** Намеснік старшыні Савета зямляцтваў БДУ (2020–2022); удзельніца V міжнароднага форуму «M.I.P»; удзельніца навуковай канферэнцыі студэнтаў і аспірантаў ФФСН (2019, 2020, 2021), суарганізатар фестывалю «Наўруз» (2021, 2022).

– Хачу пажадаць абітурыентам працаваць над сабой з першага курса. Прыкладаць шмат намаганняў да тых ведаў і мэт, да якіх імкнешся. І, падкрэсліваю, пачынаць гэта рабіць трэба не з сярэдзіны навучання, а з першага курса. Бо гэта не проста ўніверсітэт, і яму трэба адпавядаць. БДУ – мая новая сям'я, якую я набыла, прыехаўшы ў Беларусь з Туркменістана. Дзякуй тым людзям, якія падтрымлівалі мяне. Кіраўніцтва і выкладчыкі заўсёды дапамагалі добрым словам, дзеяннямі і думкамі. Калі чалавек адзін прыязджае ў чужую краіну, нічога не ведае і мала што разумее, і з'яўляюцца вакол такія людзі, якія ніколі не скажуць «не», пастараюцца вырашыць любую праблему, – гэта вельмі многа значыць.



**Карына Ліс, геафак, «Студэнцкі лідар БДУ».** Уладальніца дыплома 3 ступені на Рэспубліканскім навукова-практычным семінары студэнтаў і маладых навукоўцаў «ГІС-тэхналогіі ў навуках аб Зямлі–2021»; старшыня камісіі прафбюро па грамадскім кантролі за работай аб'ектаў гандлю і грамадскага харчавання на факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі БДУ.

– Наш універсітэт для мяне – гэта ў першую чаргу флагман ведаў, безумоўна, гарант поспеху, упэўненасць у заўтрашнім дні. Таму што з самай першай маёй хвіліны вучобы ў БДУ я задумалася, як жа мне пашчасціла тут вучыцца. Праз 4 гады навучання я ўдастоена такой узнагароды – быць сярод найлепшых выпускнікоў! Спадзяюся, што далей, падчас навучання ў магістратуры, я здолею актыўна рухацца ў грамадскім жыцці, прыносіць карысць універсітэцкай навуцы і культурнаму жыццю ўніверсітэта, а можа, і па-за ім.

**Гадам Чарыеў, філфак, «Студэнцкі лідар БДУ».** Старшыня Савета зямляцтваў БДУ; пераможца конкурсу «Студэнт года БДУ–2021» у намінацыі «Лідар» (паднамінацыя «Універсітэт»); уладальнік граматы БДУ (2021); уладальнік дыплома ІІ ступені на Рэспубліканскім фестывалі творчасці замежных студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі Fest-ART.by.



– За гэты час БДУ быў тым месцам, вакол якога будавалася ўсё маё жыццё. У кожнага, хто тут знаходзіцца, з гэтым месцам звязана мора самых розных эмоцый, самых розных успамінаў. Аднак нас аб'ядноўвае БДУ. Хачу на старонках нашай універсітэцкай газеты пакінуць словы падзякі выкладчыкам. Ваша праца – гэта прыклад энтузіязму і самааддачы. Вы здольныя заразіць выдатным настроем для дасягнення самых лепшых вынікаў. Тое, што мы ад вас засвоілі, пакажуць наша жыццё і наш поспех. Але я ўпэўнены, што вы не будзеце расчараваныя. Нашы дыпломы не проста дакумент аб вышэйшай адукацыі. Гэта вельмі вялікая адказнасць, тое, што адкрывае вялікія магчымасці для нас, выпускнікоў. І не важна, дзе кожны з нас будзе працаваць: у дзяржаўных ці прыватных структурах, унутры краіны ці за мяжой. Якіх бы вышынь мы ні дасягнулі, мы не забудзем тое месца, дзе правялі самыя лепшыя гады свайго жыцця. Жадаю ўсім выпускнікам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта 2022 года поспеху і ўпэўненасці ў сабе.



**Яна Мендзелева, журфак, «Зорка БДУ».** Лаўрэат фестывалю эстрады БДУ (2021); удзельніца Рэспубліканскага навагодняга балю (2021); удзельніца праекта «Курсы вядучых БДУ»; член аргкамітэта праекта «Студэнт БДУ на тыдзень» (2018, 2019, 2020); капітан групы падтрымкі FOX GOAL (2019).

– Журналісты, эканамісты, філолагі. Здавалася б, канцэнтрацыя настолькі розных людзей у адным месцы – падзея неверагодная. Розныя погляды на жыццё, непадобныя гісторыі, але тым не менш усе мы сёння тут. А гэта значыць, што нас нешта дакладна звязвае. І гэтае «нешта», відавочна, не проста ўніверсітэт. Гэта імкненне быць найлепшым, калі мы выбіралі ВНУ, імкненне пражыць студэнцкае жыццё максімальна насычана і яскрава, імкненне з кожным днём удасканальвацца. Мы навучыліся тут жыць, кахаць, па-сапраўднаму сябраваць. Наша сталенне праходзіла ў сценах самай лепшай ВНУ. Метадам спроб і памылак мы шукалі сябе, свой шлях. А побач заўсёды былі тыя, хто ўмеў нас правільна наставіць – гэта нашыя выкладчыкі і адміністрацыя. Я ўпэўнена, што дзякуючы ім мы такія, якія мы ёсць. Наперадзе нас чакаюць новыя выпрабаванні і магчымасці. Але да іх мы гатовыя, бо вучыліся ў прафесіяналаў. Праца будзе займаць асноўную частку нашага часу, таму хочацца пажадаць, каб кожны займаўся ўлюбёнай справай.

**Матэрыял падрыхтавалі**
**Марыя ШНА і Ганна КАЗАКОВА**

## НАШЫ ЮБІЛЯРЫ

**02 ліпеня Важнік Сяргей Аляксандравіч,** дэкан філалагічнага факультэта
**05 ліпеня Говарава Ніна Іванаўна,** дацэнт кафедры англійскай мовы міжнароднай прафесійнай дзейнасці
**14 ліпеня Васількоў Дзмітрый Міхайлавіч,** дацэнт кафедры біямедыцынскай інфарматыкі
**19 ліпеня Селіванаў Андрэй Уладзіміравіч,** дацэнт кафедры міжнародных адносін
**21 ліпеня Мяснікова Вольга Анатольеўна,** дацэнт кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання
**24 ліпеня Брыгадзіна Вольга Васільеўна,** дацэнт кафедры гісторыі Расіі
**31 ліпеня Світа Іван Антонавіч,** загадчык кафедры энергафізікі
**01 жніўня Прокашава Вера Акімаўна,** дацэнт кафедры агульнай матэматыкі і інфарматыкі
**01 жніўня Свістунова Марына Іосіфаўна,** дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства
**03 жніўня Царова Вольга Іванаўна,** дацэнт кафедры рыторыкі і методыкі выкладання мовы і літаратуры
**06 жніўня Лепяшкоў Юрый Аляксеевіч,** дацэнт кафедры міжнароднага права
**07 жніўня Уласава Галіна Міхайлаўна,** дацэнт кафедры мытнай справы
**11 жніўня Рагозін Сяргей Васільевіч,** дацэнт кафедры аналітычнай эканомікі і эканаметрыкі
**15 жніўня Балашэнка Сяргей Аляксандравіч,** прафесар кафедры экалагічнага і аграрнага права
**20 жніўня Шумейка Міхаіл Фёдаравіч,** прафесар кафедры крыніцазнаўства
**22 жніўня Валюшка-Орса Наталля Віктараўна,** дацэнт кафедры дзяржаўнага кіравання
**22 жніўня Вострыкава Алена Уладзіміраўна,** дацэнт кафедры тэарэтычнага і славянскага літаратуразнаўства
**23 жніўня Дзямідчык Вадзім Віктаравіч,** дэкан біялагічнага факультэта
**24 жніўня Джус Максім Анатольевіч,** дацэнт кафедры батанікі
**28 жніўня Пятроў Уладзімір Васільевіч,** галоўны навуковы супрацоўнік фізічнага факультэта
**28 жніўня Якіменка Таццяна Сямёнаўна,** дацэнт кафедры вэб-тэхналогій і камп'ютарнага мадэлявання
**31 жніўня Усенка Аляксандра Яўгенаўна,** дацэнт кафедры фізічнай хіміі

## БДУ Ў СМІ БЕЛАРУСІ

**БДУ прэзентуе новыя распрацоўкі на ЦІБА – 2022** – БелТА, «Мінск-навіны» (03.06), zviazda.by (05.06), радыё «Мінск», zarya.by(06.06), «Настаўніцкая газета» (09.06).

**Больш за 20 навукова-тэхнічных распрацовак прадставіць БДУ на «Белагра – 2022»** – zviazda.by (05.06), БелТА (06.06).

**Уступныя выпрабаванні ў ліцэі Беларусі пройдуць з 16 па 29 чэрвеня** – БелТА, «Мінск-навіны», 1prof.by (06.06), zviazda.by, aif.by (07.06).

**Рэпліка крыжа прападобнай Ефрасінні Полацкай перададзена БДУ** – БелТА, «Мінск-навіны» (06.06), «Настаўніцкая газета» (09.06).

**БДУ паказаў самыя высокія пазіцыі за ўсю гісторыю ўдзелу ў сусветным рэйтынгу QS** – БелТА, sb.by, «Мінск-навіны», АНТ, zviazda.by, aif.by (09.06).

**БДУ і Расійская акадэмія адукацыі падпісалі мемарандум аб паразуменні** – БелТА, sb.by, soyuz.by, zviazda.by, Беларусь-1 (14.06), «Мінск-навіны» (15.06).

**БДУ прадставіў навукова-тэхнічныя распрацоўкі ў галіне харчовай вытворчасці на міжнароднай выставе ў Іране** – sb.by (16.06), БелТА, nashkraj.by (17.06).

**Больш за 40 распрацовак прадставіў ДКНТ на міжнароднай выставе «Нацыянальная бяспека. Беларусь – 2022»** – БелТА, sb.by, rossaprimavera.ru (22.06).

**У БДУ ўшаноўвалі найлепшых выпускнікоў** – БелТА, sb.by (23.06), Беларусь-1 (24.06), АНТ (27.06).

**Кіраўнік расійскага МЗС Сяргей Лаўроў стаў ганаровым прафесарам БДУ** – БелТА, sb.by, ctv.by, soyuz.by, АНТ, ТАСС, belarus.kp.ru, rambler.ru, m24.ru, aif.ru, rossaprimavera.ru, osnmedia.ru, grodnonews.by (01.07).

## ДА ЎВАГІ



Універсітэт
1 ліпеня 2022 года, № 9 (2260)





# Крыж для капліц

**Не засталася без нашай увагі перадача ўніверсітэту рэплікі крыжа Ефрасінні Полацкай, што адбылася 6 чэрвеня.**

Недаацэньваць ролю ідэі ў творчым працэсе немагчыма, але, калі думкі ператвараюцца ў справу, патрэбная і настойлівасць арганізатараў, і падтрымка атачэння, і, зразумела ж, упартая праца рэалізатараў. Калі ўсе тры складнікі аб'ядноўваюцца, перамога наканавана. Але тыя, хто верыць у найвышэйшыя сілы, абавязкова дадаюць чацвёрты складнік – Боскую волю, што заўжды спрыяе добрым пачынанням.

Дасведчаныя ў рэлігіі людзі любую справу пачынаюць з малітвай, каб атрымаць благаславенне на добрае пачынанне. Таму невыпадкова, што і святочнае мерапрыемства ва ўніверсітэце адкрылася менавіта зваротам да Бога. Праўда, у гэтым выпадку ўжо не прасілі дапамогі, а дзякавалі за сапраўды шчодры падарунак. Разам з усімі дзякаваў Богу клірык Свята-Елізавецінскага жаночага манастыра Андрэй ЛЕМЯШОНАК, які пасля выступіў з вітальным словам:

– Каля пяці гадоў я супрацоўнічаю са сталічнымі ўніверсітэтамі, каледжамі, ад нашага манастыра дзейнічае ўжо каля 10 капліц, і прыемна, што адна з іх – у БДУ. Вынікі нашых сумесных малітваў таксама адчуваюцца. У нас з вамі агульная мэта – падрыхтавацца да вечнага жыцця, тут мы толькі вучымся жыць, вучымся любіць. Гэта немагчыма без малітваў, таму спадзяюся, што зусім хутка мы разам сустрэнемся ў капліцы БДУ. Крыж, які сёння перадалі ўніверсітэту, – сімвал надзеі на тое, што з Божай дапамогай нашы добрыя справы атрымаюцца. Знакава і тое, што сёння мы таксама адзначаем дзень памяці Ефрасінні Полацкай, 1030-годдзе праваслаўя на нашых землях, столькі ж гадоў прайшло з заснавання Полацкай епархіі. У нас з вамі шмат ідэй і планаў, якія чакаюць сваёй рэалізацыі. Асабліва гэта тычыцца чалавечага сэрца. Без Божай дапамогі, без сілы крыжа нам не справіцца, нам патрэбная гэтая дапамога, прыкладаў паспяховасці якой безліч. У Беларусі ёсць шматгадовая традыцыя, калі робяць вялікія крыжы і ставяць іх на ўездах у гарады, вёскі, і, калі здараюцца няшчасці, жыхары абыходзяць свае дамы з гэтым крыжам. Гэты сімвал веры – наша ахова.

Сапраўды, хто адмовіцца ад такой моцнай малітоўнай падтрымкі ў сваіх справах? Пры гэтым важна, каб усе пачынанні рабіліся ў першую чаргу на карысць іншым. Гэтай думкай было прасякнута выступленне дырэктара дабрачыннага фонду падтрымкі сям'і, мацярынства і дзяцінства «Пакроў» Наталлі Анатольеўны ЯРАШЭВІЧ:

– Нядаўна ўбачыла надпіс у Нясвіжскім палацы: «Шлях да славы ляжыць праз дабрадзейнасць». Мне прыйшла ў галаву думка, што людзі і ў тыя часы ведалі цану добрых учынкаў у жыцці чалавека. У гэтым кантэксце добры прыклад – Ефрасіння Полацкая, якая ўсё рабіла не дзеля славы, але дзякуючы яе справам беларуская культура зрабіла вялікі крок наперад, а жыццё святой стала прыкладам для ўсіх пакаленняў беларусаў. Я ўпэўнена, што і гэты крыж, і іконы асветніцы, што ёсць ва ўніверсітэце, натхняць усіх, хто мае дачыненне да БДУ, на добрыя справы для ўсіх нас. Цікава і невыпадкова тое, што, калі стваралася капліца па благаславенні айца Андрэя Лемяшонка, ініцыятыўная група ад манастыра прапанавала назваць яе ў гонар Ефрасінні Полацкай, але ніхто з прадстаўнікоў групы не ведаў, што ў нас ва ўнутраным дворыку стаіць помнік менавіта гэтай святой.

Падкрэсліў важнасць асобы святой як для беларускай культуры, так і для універсітэта прарэктар па выхаваўчай рабоце і сацыяльных пытаннях Іван Іванавіч ЯНУШЭВІЧ:

– Безумоўна, цяжка пераацаніць уплыў падзей тысячагадовай даўніны на гісторыю беларускага народа, яны сталі краевугольным каменем нашай культуры. Надзвычай важна, што на шляху нашага станаўлення былі такія людзі, як Ефрасіння Полацкая. Бо, калі задумацца, яна арганізавала вакол сябе як бы ўніверсітэт: разам з манахінямі займалася і адукацыйнай, і навуковай дзейнасцю, і, што асабліва важна для нас, выхаваўчай, якая дазваляла сфарміраваць фундаментальныя асновы светапогляду, якія робяць чалавека чалавекам. Усё важнае для выхавання ўжо вынайдзена і паказана ў Бібліі, у жыццях такіх людзей, як наша святая Ефрасіння Полацкая. І гэта для нас базіс, ад якога трэба адштурхоўвацца. Нашы студэнты – наш гонар, і мы рыхтуем сапраўдных лідараў, але ў першую чаргу людзей высокадухоўных і высокамаральных. Упэўнены, што дзякуючы малітоўнаму заступніцтву Ефрасінні Полацкай мы будзем адчуваць сябе абароненымі.

Безумоўна, адной з галоўных асоб на мерапрыемстве стала куратар клуба аматараў літаратурнага слова «КЛУмБа» і мастацкага кіраўніка групы «Лілея» Ірына ШКІРОНАК. Менавіта дзякуючы яе ідэям і намаганням імпрэза была арганізавана. Пра тое, як нарадзілася задума пра крыж, яна падзялілася з усімі прысутнымі ў сваёй прамове:

– У нашага калектыву сёння двайное свята, да якога мы крочылі цэлы год. Прыкладна год назад у нас з'явілася ідэя, што ў БДУ трэба стварыць спектакль, прысвечаны Ефрасінні Полацкай, якую так вылучае наш універсітэт і помнік якой стаіць ва ўнутраным дворыку. Вопыт стварэння духоўных спектакляў у нас ужо быў, і пасля таго, як у БДУ адкрылася капліца ў гонар святой, мы вырашылі дзейнічаць. Першым крокам стала паездка ў Спаса-Ефрасіннеўскі манастыр да матушкі Еўдакіі. Яна азнаёмілася з ідэяй і тэкстам спектакля, але не дала нам благаславення. Мы не страцілі надзею, і праз тыдзень у нас ужо быў новы сцэнарый. Яго благаславілі. У падрыхтоўцы тэксту нам дапамагала матушка Раманія, якая правярала кожны радок, каб ён быў духоўна вывераным і правільным. Наступны крок – прэм'ера на сцэне Свята-Елізавецінскага манастыра, дзе мы атрымалі падтрымку ад гледачоў і благаславенне, каб паказваць гэты спектакль далей. Так і здарылася: нашу пастаноўку бачылі на калядным фестывалі «Радасць» у Палацы мастацтваў, у Лагойскім доме-інтэрнаце для інвалідаў і састарэлых, у Полацкім медыцынскім каледжы, ва ўніверсітэце фізічнай культуры і не толькі. Сёння, праз год гастроляў па ўсёй Беларусі, мы рады прадставіць спектакль гледачам і нашага ўніверсітэта. Дарэчы, спектакль на беларускай мове, бо нам падалося, што так святая будзе яшчэ больш блізкай да нас.

Але вернемся ў самы пачатак гэтай гісторыі. Калі я пачала пісаць сцэнарый, падумала, што было б добра БДУ мець свой крыж. На той момант я ўжо ведала рамесніка, які змог бы выканаць гэтае заданне, пытанне было толькі ў фінансаванні. Я патэлефанавала Наталлі Анатольеўне, і адразу, у той жа тэлефоннай размове, яна запэўніла, што фонд «Пакроў» падорыць нам яго. Так усё і атрымалася. Ювелірная копія крыжа была зроблена вядомым ювелірам Алегам Ермалінскім, а рэпліку для БДУ зрабіў сталічны рамеснік Генадзь, у якога не аднойчы замаўлялі крыжы нават для прадстаўнікоў іншых краін. У нашым крыжы натуральныя камяні, і наогул усё супадае з арыгіналам – памеры, надпісы, лікі святых, арнаменты. Крыж быў асвечаны ў Спаса-Ефрасіннеўскім манастыры і прыкладзены да мошчаў святой.

Пасля выступлення Ірыны Сцяпанаўны ўсе ўдзельнікі мерапрыемства ўбачылі той самы спектакль, з якога ўсё пачалося. Дзеянне адбываецца ў капліцы БДУ, дзе студэнты сустракаюцца, абмяркоўваюць духоўную літаратуру, сябруюць і растуць як асобы. Як пасля адзначылі арганізатары, для напісання былі выкарыстаны фота з аддзела рэдкай кнігі пры нашай бібліятэцы, вершы беларускіх пісьменнікаў, у тым ліку творы члена Саюза пісьменнікаў Беларусі, супрацоўніцы нашай бібліятэкі і кіраўніцы клуба аматараў літаратурнага слова «КЛУмБа» Кацярыны Роўда.

Традыцыйна пасля імпрэзы госці зрабілі агульнае фота з акцёрамі, сярод якіх – студэнты розных факультэтаў, большая частка – з філфака. Невыпадкова, што выступленне сваіх падапечных прыйшоў паглядзець дэкан філалагічнага факультэта Сяргей Аляксандравіч ВАЖНІК:

– Філолагі – гэта захавальнікі не толькі пісьменніцкіх традыцый, але і ўвогуле нацыянальных традыцый, таму для мяне не дзіва, што студэнты менавіта нашага факультэта прынялі такі актыўны ўдзел у гэтай цудоўнай духоўнай імпрэзе, што ўзвялічвае подзвіг святой. Дарэчы, першапачаткова разглядаўся варыянт, у якім крыж павінны былі перадаць філалагічнаму факультэту, але мы адмовіліся, бо гэта святыня нацыянальнага маштабу. Быць можа, менавіта Ефрасінні Полацкай надаецца асаблівая ўвага ў БДУ праз тое, што, як пажартаваў адзін літаратурны крытык, «беларусы – гэта жаночая нацыя». Полацкая святая зрабіла вельмі значны ўнёсак у культуру краіны, нашмат больш значны, чым некаторыя мужчыны яе часу.

У БДУ вывучэннем асобы Ефрасінні Полацкай займаюцца не на адным факультэце, аднак найбольшы ўклад унесла Крысціна Ігараўна КАЗЛОВА, старшы выкладчык кафедры біблеістыкі і хрысціянскага веравучэння Інстытута тэалогіі імя святых Мяфодзія і Кірыла. Яна абараніла кандыдацкую дысертацыю «Узнікненне і станаўленне Полацкай епархіі ў X – першай палове XVI ст-ст.», значнае месца ў якой займае аналіз асобы святой Ефрасінні ў беларускай гісторыі і культуры.

***– Які ўнёсак Ефрасінні Полацкай стаў асабліва важным для распаўсюджвання на беларускіх землях адукацыі сярод дарослага насельніцтва, і асобна – жанчын і дзяцей?***

– З прыняццем хрысціянства на Русі ў 988 годзе быў пакладзены і пачатак духоўнай асвеце. Глыбокае па сваім змесце хрысціянскае веравучэнне магло ўвайсці ў свядомасць людзей толькі пры ўмове яго асэнсаванага ўспрымання. Згодна з летапісам, пасля хрышчэння кіяўлян князь Уладзімір загадаў «браць у лепшых грамадзян дзяцей і аддаваць іх на кніжнае навучанне». Натуральна, з часам сталі з'яўляцца школы і ў іншых гарадах Кіеўскай Русі, паколькі распараджэнне князя Уладзіміра пра навучанне дзяцей тычылася не толькі Кіева. Верагодна, жаданне князя зводзілася да таго, каб пры парафіяльных цэрквах былі школы, у якіх мясцовае духавенства займалася б навучаннем народа. У асноўным вучылі чытанню, пісьму, царкоўным спевам і лічэнню. Больш шырокую адукацыю ў тыя часы атрымлівалі праз самастойнае чытанне кніг, але з-за высокага іх кошту гэта маглі дазволіць сабе толькі заможныя людзі.

Перапісваннем і збіраннем кніг займаліся ў асноўным манастыры. Там глядзелі на гэтую справу як на вялікі богаўгодны подзвіг,










# цы БДУ

некаторыя манахі прысвячалі гэтаму ўвесь час, які ў іх заставаўся ад малітвы. Для перапісвання кніг некаторыя манастыры часам знарок пасылалі сваіх манахаў у Студыйскі манастыр у Канстанцінопалі ці на Афон.

Галоўнымі распаўсюджвальнікамі духоўнай асветы былі князі, найвышэйшае духавенства і манастыры, як тыя, хто меў магчымасці для заснавання школ. Такім чынам, першыя школы пачалі ўзнікаць у тых гарадах, дзе знаходзіліся епіскапскія кафедры або жылі ўдзельныя князі.

Для Полацкага княства такім цэнтрам кніжнай асветы быў старажытны горад Полацк, які справядліва лічыцца калыскай хрысціянства ў Беларусі. На працягу стагоддзяў ён з'яўляўся адным з найбуйнейшых рэлігійных цэнтраў на нашай тэрыторыі, які меў мноства цэркваў і манастыроў. У рознай ступені захаванасці да нас дайшло толькі некалькі помнікаў – гэта Спаса-Праабражэнская царква Спаса-Ефрасіннеўскага манастыра, заснаваная прападобнай Ефрасінняй Полацкай, і полацкі Сафійскі сабор – два цэнтры распаўсюджвання кніжнасці на полацкай зямлі.

***– Чым святая адрознівалася ад жанчын-асветніц у гісторыі і культуры іншых краін?***

– Створаная прападобнай Ефрасінняй жаночая школа – цікавая з'ява ў гісторыі старажытнарускай культуры. Аднак мы маем падобны прыклад такой школы на Русі. Так, у Кіеве сястрой Уладзіміра Манамаха Ганнай Усеваладаўнай, таксама манахіняй, у 1086 г. была заснавана школа пры Андрэеўскім жаночым манастыры. В. М. Тацішчаў пад 1086 годам піша: «Всеволод заложил церковь святого Андрея при Иоанне Добром, митрополите русском, и построил при церкви оной монастырь женский, в котором постриглась первая дочь его, девица Анка... Собравши же младых девиц неколико, обучала писанию, також ремеслам, пению, швению и иным полезным им ремеслам, да от юности навыкнут разумети закон Божий и трудолюбие». Сярод даследчыкаў дагэтуль вядуцца спрэчкі, наколькі дакладная ўнікальная звестка пра гэта В. М. Тацішчава, які, бясспрэчна, валодаў крыніцамі, якія не захаваліся да нашага часу. Так ці інакш, у старажытнай Русі сама па сабе жаночая школа ні ў кога не выклікала здзіўлення.

Трэба адзначыць, што ўяўленні пра прападобную Ефрасінню як пра асветніцу, хоць і агульнапрынятыя, грунтуюцца выключна на звестках яе «Жыцця» і паданнях, таму што ніякіх матэрыяльных сведчанняў – рукапісаў, твораў, павучанняў, выказванняў, якія гавораць пра яе асветніцкую дзейнасць, да нашых дзён не захавалася. Аднак такі матэрыял даюць нам фрэскі Спаскай царквы, пабудаванай і распісанай пры яе непасрэдным удзеле.

Так, адна з граняў кніжнай мудрасці прападобнай Ефрасінні раскрываецца ў патэрыках, г. зн. у сцэнах на тэму манаскіх подзвігаў. Трэба адзначыць, што такія кампазіцыі ў храмавых росписах для сярэдневізантыйскага перыяду былі рэдкай з'явай, а для свайго часу полацкі цыкл можна лічыць найбольш поўным, разнастайным і старажытным. Кампазіцыі адрозніваюцца рэдкім падбором сюжэтаў, многія сцэны суправаджаюцца тлумачальнымі надпісамі, літаратурная аснова сюжэтаў узыходзіць да розных патэрыкоў і іншых твораў. Калі вызначаць іх крыніцы, становіцца відавочным, што яны ўзяты не з аднаго твора, а з'яўляюцца выбаркай з розных жыццёвых зборнікаў. Так, цыкл выяў жыцця прападобнага Антонія Вялікага адсылае да меналогія Сімяона Метафраста, сцэна з прападобным Іаанам Лествічнікам, відавочна, узята з «Лествіцы». Дзве кампазіцыі, якія ілюструюць гісторыю пра Сілуана і яго вучня, узыходзяць да так званага «Старажытнага патэрыка», гісторыя прападобнага Герасіма Іарданскага выкладзена ў «Лузе Духоўным» прападобнага Іаана Мосха, «Слова пра чарнарызца Мартырыя» ўзыходзіць да Пралогу. Такім чынам, пералік крыніц па манаскіх жыццях сведчыць пра багацце бібліятэкі прападобнай Ефрасінні.

Яшчэ некалькі цікавых кампазіцый, якія пацвярджаюць той факт, што ў распараджэнні полацкай ігумені мелася шырокае кола літаратуры, знаходзяцца ў алтарнай частцы храма. Гэта выявы сцэн з жыццяў святамучаніка Дыянісія Арэапагіта і Канстанцінопальскага патрыярха Паўла Вызнаўца, якія па сваім змесце адносяцца да тыпалогіі жыццёвых ілюстрацый, што збіраліся ў меналогіях. Відаць, прападобная Ефрасіння мела такі багата ілюстраваны гадавы меналогій, хутчэй за ўсё візантыйскага паходжання, які служыў узорам для падобнага роду сюжэтаў.

Прынцыпова важнымі ў развіцці тэмы духоўнага асветніцтва з'яўляюцца дзве кампазіцыі, якія паказваюць «Крыніцы Мудрасці» вялікіх айцоў і настаўнікаў царквы – святціцеляў Іаана Залатавуста і Рыгора Багаслова, у якіх паказана перадача кніжнай мудрасці, «вады жывой». У якасці ўспрымальнікаў гэтай мудрасці паўстаюць манахі, адметнай асаблівасцю фігур якіх з'яўляецца наяўнасць у большасці з іх разгорнутых скруткаў з вялізнымі надпісамі, звернутымі непасрэдна да паствы.

Адмысловае месца ў праграме роспісаў займаюць выявы манахаў, пры гэтым адзін з галоўных акцэнтаў робіцца на настаўніцкай місіі манаства, што, відома ж, знаходзіла поўнае сугучча з асобай самой прападобнай Ефрасінні.

Такім чынам, уключэнне розных кніжных матываў у роспісы Спаскай царквы паказвае, што полацкай ігумені былі даступныя самыя разнастайныя кнігі, як шырокага распаўсюджвання, так і больш вузкага, спецыфічнага зместу. Відаць, у яе бібліятэцы былі ілюмінаваныя рукапісы, апракасы, Псалтыр, меналогіі, сінаксары і пралогі.

***– Што дакладна вядома пра адукацыю і ўменні святой?***

– Паводле «Жыцця прападобнай Ефрасінні», якое дайшло да нас у спісах XVI стагоддзя, але складзенае ў XII–XIII стст., галоўным культурным цэнтрам полацкай зямлі быў Сафійскі сабор. Менавіта тут пасялілася будучая святая, якая да гэтага праходзіла выпрабаванне ў манастыры, заснаваным яе цёткай, князёўнай Раманавай. Па ўсёй верагоднасці, у Сафійскім саборы прападобную Ефрасінню прыцягвала ў тым ліку і бібліятэка. Займаючыся перапісваннем і распаўсюджваннем кніг, яна сваёй працавітасцю адкрывала кніжную мудрасць і іншым людзям. Грошы ж, атрыманыя ад продажу кніг, напісаных ёю самой і нанятымі пісцамі, яна ўпотайкі раздавала жабракам. У каноне прападобнай Ефрасінні працы яе па перапісцы кніг паэтычна прыпадабняюцца далёкаму плаванню: «Издалека собирая Божественное богатство, как плавающий в дальние страны корабль, искусно переписывала книги, Богодухновенная, раздавая тайно полученные за них деньги нищим».

Магчыма, дзякуючы працам прападобнай Ефрасінні былі закладзены асновы каштоўнай і багатай бібліятэкі, у якой захоўваліся ў тым ліку і полацкія летапісы. Звесткі пра гэту бібліятэку ўпершыню з'яўляюцца ў сувязі з трагічнымі падзеямі яе ліквідацыі ў 1579 г. Гэтыя звесткі знаходзяцца ў «Запісках аб Маскоўскай вайне» афіцыйнага польскага гісторыка, сакратара караля Стэфана Баторыя Рэйнгольда Гейдэнштэйна, які паведамляе, што рознапляменныя салдаты польскага войска намагаліся пранікнуць у Полацкую крэпасць, каб захапіць каштоўнасці, якія захоўваліся там, і асабліва ў Сафійскім саборы. Пры гэтым ён адзначае, што «ў вачах адукаваных людзей амаль не меншую каштоўнасць, чым уся астатняя здабыча, мела знойдзеная там бібліятэка. Акрамя летапісаў, у ёй было шмат твораў грэчаскіх айцоў царквы...».

Праз некаторы час знаходжання прападобнай Ефрасінні ў келлі пры Сафійскім саборы, паводле яе жыцця, епіскап Ілія атрымаў ад анёла Божага ўказанне аддаць ёй месца, пад назвай Сяльцо, якое знаходзілася недалёка ад Полацка, для заснавання новага манастыра. Тут у Спаскай царкве былі пахаваны папярэднікі епіскапа Іліі на Полацкай кафедры. Такі ж загад, пасяліцца ў Сяльцы, атрымала ад анёла і сама прападобная. І менавіта ў гэтым вядомым усім месцы – епіскапскім валоданні – і быў заснаваны Спаскі манастыр, які стаў цэнтрам кніжнасці і асветы ўсёй Полацкай зямлі.

Адпраўляючыся ў Сяльцо, Ефрасіння ўзяла з сабой толькі кнігі – «утешает ми ся душа и сердце веселит». Так, з першых дзён існавання Спаскага манастыра тут ствараецца бібліятэка, у аснову якой леглі ўласнаручна перапісаныя князёўнай кнігі. У хуткім часе пры манастыры была адкрыта і школа, у якой сама ігуменя і запрошаныя ёю настаўніцы навучалі дзяўчат, што прыходзілі ў манастыр, Закону Божаму, чытанню, пісьму, рукадзеллям. Хоць жыццё прападобнай Ефрасінні кажа пра школу як бы між іншым, у сувязі з іншымі подзвігамі прападобнай, мы бачым, што бацькі аддавалі сваіх дачок у школу да Ефрасінні спакойна, і нават не дзівіліся словам настаўніцы, што яна не адпусціць вучаніц да заканчэння навучання.

Паступова манастыр прападобнай Ефрасінні рос. У ім пастрыглася яе сястра – Гарадзіслава, названая Еўдакіяй, і яе стрыечная сястра, дачка друцкага князя Барыса – Звеніслава, у пострыгу атрымала імя Еўпраксія. Цікавы ў гэтых адносінах эпізод з жыцця аб пострыгу князёўны Гарадзіславы. Прападобная папрасіла свайго бацьку адпусціць да яе сястру для навучання грамаце, пры гэтым «с прилежанием учаше ея спасению души; сия же со прилежанием приимаше, яко нива плодовита умягчивши сердце свое». Праз некаторы час Гарадзіслава гэтак жа, як і яе сястра, захацела прыняць манаства. Такім чынам, прападобная Ефрасіння навучанне грамаце спалучала з настаўленнямі аб выратаванні душы.

***– У сувязі з развіццём прыродазнаўчых навук адукацыя стала страчваць сувязь з рэлігійным выхаваннем і светапоглядам. На Вашу думку, ці ёсць зараз тэндэнцыя да вяртання выхаваўчага кампанента адукацыі ў рэлігійную традыцыю?***

– Так, сапраўды, зараз такая тэндэнцыя ёсць. У прыватнасці, на тэрыторыі нашай краіны ёсць некалькі рэлігійных навучальных устаноў – дзве семінарыі (Мінская і Віцебская), Мінская духоўная акадэмія (МінДА), Інстытут тэалогіі, Мінскае духоўнае вучылішча. І навучэнцы, і выкладчыкі, і святары – усе разам у адукацыйным працэсе. Ладзяцца разнастайныя (у тым ліку інтэрактыўныя) мерапрыемствы, лекцыі. Студэнтамі Інстытута тэалогіі, напрыклад, у іншых установах адукацыі праводзяцца тэматычныя размовы па гісторыі праваслаўя, яго ролі ў фарміраванні культуры беларускага народа і дзяржаўнасці. Можна таксама засведчыць значную выхаваўчую работу нашага інстытута з моладдзю, напрыклад, мы штогод арганізуем конкурс творчых і даследчых работ духоўна-маральнай тэматыкі «Свет праваслаўя».

**Ксенія СІТНІК**

УНІВЕРСІТЭТ
1 ліпеня 2022 года, № 9 (2260)

# Віктар Іўчанкаў: «Рабіць людзей крыху шчаслівейшымі…»

**Загадчык кафедры медыялінгвістыкі і рэдагавання Віктар Іванавіч Іўчанкаў 28 чэрвеня святкуе 60-гадовы юбілей. Амаль палову жыцця ён прысвяціў працы ў БДУ. За гэты час стаў аўтарам больш чым 500 навуковых і метадычных работ, заснавальнікам даследчай школы дыскурснага аналізу СМІ ў Беларусі і адным з навуковых кіраўнікоў новай рэдакцыі «Правіл беларускай арфаграфіі і пунктуацыі». Віктар Іванавіч расказаў газеце «Універсітэт» пра тэндэнцыі ў СМІ, культуру маўлення, падыходы да працы і пра стаўленне да маладых навукоўцаў.**



***– Раскажыце, як пачалося ваша прафесійнае развіццё ў БДУ? Чаму вы абралі гэты ўніверсітэт?***

– Калі шчыра, то ў БДУ я трапіў выпадкова. Я заканчваў аспірантуру ў Інстытуце мовазнаўства імя Якуба Коласа Нацыянальнай акадэміі навук. Былі прапановы застацца ў самім інстытуце, паехаць у Брэст, працаваць у Мінскім педінстытуце імя М. Горкага. Але найбольш уплывовай была прапанова першага афіцыйнага апанента – доктара філалагічных навук прафесара Аркадзя Іосіфавіча Наркевіча. Ён загадваў кафедрай стылістыкі і літаратурнага рэдагавання на журфаку БДУ. На абароне маёй кандыдацкай дысертацыі ён і пацікавіўся, ці не хачу я працаваць на журфаку. І прапанаваў стаўку дацэнта. Як пасля ён прызнаваўся, на гэта паўплываў той факт, што дысертацыю я абараніў датэрмінова. Для таго часу гэта была рэдкасць…

Так атрымалася, што паколькі ў мяне былі дзве спецыяльнасці («руская мова» і «беларуская мова»), то трэба было, каб у склад савета па абароне быў уведзены русіст. Ім быў Брыцын Міхаіл Акімавіч з Кіеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта. Пасля абароны ён сказаў добрыя словы на мой адрас і патэлефанаваў свайму сябру – Міхаілу Гапеевічу Булахаву, вядомаму ў Беларусі стылісту і лінгвісту. У той час ён працаваў у Мінскім педагагічным інстытуце загадчыкам кафедры агульнага, рускага і славянскага мовазнаўства і меў патрэбу ў маладых кадрах. Міхаіл Гапеевіч запрасіў мяне на працу. Было прыемна. Гэта быў вельмі аўтарытэтны навуковец. Тады перада мной узнікла дылема: куды пайсці працаваць?

Вось так трапіў на працу адразу ў два месцы: ў Мінскі педагагічны інстытут імя Максіма Горкага і паралельна на факультэт журналістыкі БДУ. Пасля года сумяшчэння я выбраў журфак, і ў 1990 годзе быў залічаны на пасаду дацэнта кафедры стылістыкі і літаратурнага рэдагавання.

***– Вы амаль 30 гадоў вывучаеце дыскурс беларускіх СМІ і арганізацыю публіцыстычнага тэксту. Як вызначылі для сябе менавіта гэтую сферу навуковых інтарэсаў?***

– З таго моманту, калі я прыйшоў працаваць на журфак, пачалася абсалютная новая, неверагодная эпоха ў маім прафесійным жыцці, звязаная з мовай сродкаў масавай інфармацыі. Дагэтуль я займаўся мастацкім тэкстам і вывучаў стылістыку тропаў Юрыя Іванавіча Казакова, мову твораў Уладзіміра Караткевіча. Зразумела, што падчас працы на факультэце журналістыкі мне патрэбна было пераарыентавацца на даследаванне тэхналогій стварэння медыятэксту, чаму я прысвяціў, можна сказаць, усё сваё жыццё.

Я зразумеў, што ў журналістыцы мала вывучаць толькі тэкст. Трэба яшчэ і назіраць, як ён вырашае трыадзіную задачу: інфармавання, камунікатыўнай устаноўкі і дасягнення перлакутыўнага эфекту. Яна сфармулявана яшчэ ў антычнасці: docere, movere, delectare. Тады ў 1990-я гады я прыйшоў да смелай для таго часу даследчай думкі: што ёсць дыскурсны аналіз? Гэта адбылося пад уплывам еўрапейскага навукоўца Тэўна Адрыянуса ван Дэйка – аўтара кнігі «Мова, пазнанне, камунікацыя», якая мяне проста ўразіла. Дарэчы, мне пашчасціла з ім пазнаёміцца на пецярбургскай канферэнцыі ў 2013 годзе. Сам тэкст мала што азначае для даследчыка. Вельмі важна назіраць, як ён функцыянуе ў часе і ў прасторы, як акумулюе ў сабе веды праз прызму пазнання (кагнітыўнага працэсу). Гэта падахвоціла мяне паглядзець на медыятэкст як на ментальны выразнік ці малюнак эпохі, што можа паказаць, як думае і чым жыве грамадства. Таму і стаў цікавіцца менавіта гэтым кірункам, які прывёў да доктарскага даследавання «Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту».

***– Давайце зараз крыху закранём яшчэ адну тэму. Што назіраеце: якія зараз тэндэнцыі ў сучасных СМІ? Ці павышаецца культура маўлення?***

– З развіццём сучасных тэхналогій змяняюцца метады апрацоўкі інфармацыі і спосабы яе дыстрыбуцыі. Мяняецца і сам тэкст. Калі раней у эпоху друкаваных СМІ ён быў лінейны, то зараз стаў палікодавым. Мяняюцца і спосабы ўспрымання інфармацыі, і сама культура маўлення. Гаворка ідзе пра змену спосабаў выказвання думак на пісьме, калі з'яўляюцца тыя ж смайлікі, стыкеры, мемы і іншыя экспрэсівы.

Увогуле, XX стагоддзе было стагоддзем строгай нарматыўнасці маўлення. Мова СМІ рэгулявалася па даведніках Дзітмара Эльяшэвіча Разенталя, і гэтыя правілы нельга было парушаць. У XXI стагоддзі ўсё кардынальна памянялася, адбылася, так бы мовіць, дэмакратызацыя маўлення. Адбываецца дэканструкцыя кастамараўскага прынцыпу стандарту экспрэсіі. Стандарт і экспрэсія ў нейкім сэнсе пачынаюць мяняцца месцамі.

У XX стагоддзі журналіст быў не персаніфікаваны. Шматлікія артыкулы (напрыклад, передавы) нават не мелі подпісу, пазначэння, хто іх аўтар. Галоўны рэдактар «Савецкай Беларусі» Павел Якубовіч першым у Беларусі ўвёў практыку дадаваць на газетныя палосы невялікія фота аўтараў матэрыялаў. Пачалі з'яўляцца аўтарскія калонкі, блогі і іншыя жанры і фарматы. Разам з персаніфікацыяй маўленне журналістаў станавілася больш разнявольным. Гэта закранае і культуру маўлення. Журналіст можа праявіць свой індывідуальна-аўтарскі стыль.

Зараз часта ўзнікаюць дыскусіі: што сёння з'яўляецца моўным эталонам. У XX стагоддзі гэта была мова мастацкай літаратуры, тэатраў, тэлебачання. У XXI стагоддзі гэту функцыю на сябе паступова перацягвае медыяпрактыка. Відавочна, што культура маўлення зніжаецца. Але гэта не негатыўная тэндэнцыя. Проста чалавек стаў мець больш доступу да выражэння сваіх думак. Я часта прыводжу адзін паказальны просты прыклад. Калі толькі прыйшоў працаваць на журфак, то на сталах, крэслах у актавай зале можна было прачытаць амаль што ўсю гісторыю факультэта. Зараз уся мэбля чыстая, бо студэнты выражаюць свае думкі ў віртуальнай прасторы. Мы ў стадыі росту свайго вербальнага выражэння думак, меркаванняў, камунікатыўнага працэсу ўвогуле, які неверагодна пашырыўся для сучасніка. Ніколі яшчэ чалавек не быў пагружаны ў фокус тэксту, як сёння.

***– Падчас адной з прэс-канферэнцый вы расказвалі пра неабходнасць стварэння інфармацыйна-даведачнага партала па беларускай пісьменнасці. Раскажыце, у чым Вы бачыце актуальнасць развіцця такога праекта?***

– Гэты партал я умоўна называў «Правапіс.бай». Справа вось у чым. У шматлікіх краінах ёсць даволі зручны інструмент для прафесійнай дзейнасці журналіста – гэта інфармацыйна-даведачныя парталы. Напрыклад, у Расіі вельмі папулярны рэсурс «Грамота.ру». Дастаткова ўвесці запыт у акенца і аператыўна даведацца, як правільна пісаць ці ўжываць словы. На жаль, такога беларускамоўнага партала пакуль няма. Ведаю, што ў Інстытуце мовазнаўства працуюць над падобнай канцэпцыяй праекта. Гэта пазітыўна паўплывала б на павышэнне якасці журналісцкіх матэрыялаў. Выдатна, калі б знайшліся сродкі ці быў бы выдзелены грант для развіцця такога партала.

***– Вы сталі ўладальнікам галоўнай прэміі «Найлепшы арганізатар НДР студэнтаў і аспірантаў» БДУ. Якія метады работы з маладымі навукоўцамі Вы вызначылі для сябе? Як матываваць новае пакаленне займацца навукай?***

– Вельмі паважаю маладых людзей, якія ідуць у навуку. Упэўнены, што гэтае жаданне фарміруецца падчас навучальнага працэсу і залежыць ад выкладчыка. Перш за ўсё прашу пазнаёміцца з кнігай «Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту». Калі мае думкі не адштурхоўваюць будучага магістранта, то ёсць усе шанцы стаць маім аспірантам. І стаць паспяховым навукоўцам, якімі сталі, напрыклад, дактаранты Вольга Уладзіміраўна Лушчынская, Святлана Вячаславаўна Харытонава, Тацяна Уладзіміраўна Саладоўнікава, аспіранты і саіскальнікі Вольга Аляксандраўна Горбач, Сяргей Віктаравіч Зелянко, Пятро Пятровіч Жаўняровіч. Усе яны добра знаёмыя з тэорыяй кагнітыўнай апрацоўкі медыядыскурсу. У нас атрымалася даволі паспяховае дысертацыйнае супрацоўніцтва.

А што да матывацыі займацца навукай, лічу, што тут галоўнае – чалавечыя адносіны. Да студэнтаў і аспірантаў я заўсёды імкнуся ставіцца інтэлігентна, з вялікай павагай. Нягледзячы на іх малады ўзрост і невялікі досвед, кожны з маіх вучняў – гэта асоба, у якой таксама шмат чаму можна павучыцца. За 30 гадоў працы я ўжо навучыўся распазнаваць сапраўдных інтэлектуалаў сярод студэнтаў і аспірантаў, менавіта іх стараюся накіроўваць і падтрымліваць. Вельмі важна на асабістым прыкладзе паказваць такім людзям, як можна інтэрпрэтаваць навуковыя факты, як навучыцца аналізаваць, супастаўляць, рабіць выбар.

***– Вы ўжо трэці год запар узначальваеце рэйтынг найлепшых выкладчыкаў БДУ. Падзяліцеся сакрэтам, у чым падмурак паспяховай працы і што трэба развіваць маладым выкладчыкам, каб таксама апынуцца ў топе гэтага рэйтынгу?***

– Шчыра сказаць, ніколі не ставіў за мэту быць рэйтынгавым, топавым. А вось дасягаць мэты і вырашаць актуальныя задачы – гэта маё. Упэўнены, што вялікага сакрэту няма: усё гэта дзякуючы адданай працы. Трэба любіць тое, чым займаешся. Прывык шмат працаваць яшчэ падчас розных сумяшчэнняў: і ў Савеце Міністраў, калі выкладаў там родную мову, і ў Акадэміі кіравання, і ў Міністэрстве адукацыі, дзе амаль 20 гадоў быў саветнікам міністра па сувязях са СМІ і грамадскасцю, і ў рэдакцыях газет і часопісаў, дзе вёў розныя рубрыкі, і на «Сталічным тэлебачанні», і ў Белтэлерадыёкампаніі, дзе працую і зараз. Спадзяюся, што гэта ніяк не адбілася на маёй сям'і. У мяне двое дзяцей. Сям'я заўсёды была на першым месцы.

Да працоўнай нагрузкі, як і да свайго ўзросту, стаўлюся па-людску: як узнагароду, прымаю пражытыя гады, сумесную працу з калегамі. Для мяне час не бяжыць, як здаецца іншым, а ходзам цягнецца. Калі ўзяць гады працы ў Міністэрстве адукацыі, накласці на 26 гадоў загадвання кафедрай і 32 гады працы на журфаку БДУ, то гэта амаль да 80 гадоў дабіраецца. На жаль, з развіццём тэхналогій людзі перасталі шанаваць свой узрост і нават сталі яго саромецца. Не дзіўна, што зараз унук вучыць дзеда націскаць кнопкі і посціць фота ў сацсетках. Дзіўна, што людзі неўпрыкметку страчваюць самае галоўнае – пашану да жыццёвай мудрасці пры ўсёй імгненнасці інфармацыйнага колазвароту.

Маладым параю тое, што і раблю ўсё жыццё: шчыраваць у працы. Можа, гэта і пафасна, але маё хобі – рабіць чалавека крышачку шчаслівейшым. Насамрэч, гэта не так складана: штодня ёсць сотні такіх магчымасцяў. Бо шчасце – у дробязях. Гэта, напрыклад, ад душы дапамагчы дыпломніку, у якога не заўсёды атрымліваецца: крыху надыктаваць, падказаць кнігу, паправіць тэкст. Якое ж задавальненне потым чытаецца ў вачах людзей, у якіх атрымліваецца дасягнуць выдатнага выніку. Перад вачыма ўчарашнія выпускнікі Алег Шышлоўскі і Ксенія Сітнік, якія чакалі ля аўдыторыі пасля ДЭК. Якім шчасцем свяціліся іх вочы, як проста ім было гаварыць словы ўдзячнасці! Прыемна радавацца за калег, якія змаглі абараніць дысертацыі. Незвычайнае пачуццё яны адчуваюць, калі разумеюць, што змаглі заняць жаданае месца ў жыцці, павысіць свой навуковы статус, прыдбаць аўтарытэт у даследчым асяродку. І хоць не знаю да слёз, гэтыя з радасцю прымаю.

Вельмі добрую звычку мы калісьці заклалі ў сваёй сям'і. Увечары абмяркоўваць з дзецьмі, а што ж добрага і карыснага змаглі зрабіць за дзень. Вось калі рэгулярна задавацца такім пытаннем, поспех абавязкова прыйдзе…

**Марыя ШНА**

# Тры пакаленні беларускіх геолагаў

Працягнуў сямейную справу, выдаў 140 навуковых публікацый, падрыхтаваў двух кандыдатаў навук, арганізаваў 6 міжнародных канферэнцый і дзясяткі экспедыцый. Усё гэта заслугі загадчыка кафедры рэгіянальнай геалогіі Алега Лукашова – сына члена-карэспандэнта НАН Беларусі Валянціна Лукашова і ўнука акадэміка АН БССР Канстанціна Лукашова. Ён распавёў газеце «Універсітэт» пра выбітную дынастыю навукоўцаў-геолагаў.



*Канстанцін Ігнатавіч Лукашоў (1907–1987) – вядомы геолаг, геахімік, стваральнік універсітэцкай кафедры геахіміі і карысных выкапняў, якая паклала пачатак геахімічным даследаванням і фарміраванню беларускай геахімічнай школы. У 1938–1939 гадах узначальваў Ленінградскі дзяржаўны ўніверсітэт, а ў 1952–1956 гг. – рэктар БДУ. Акадэмік АН БССР, стваральнік і першы дырэктар Інстытута геахіміі і геафізікі.*



*Валянцін Канстанцінавіч Лукашоў (1938–1998) – доктар геолага-мінералагічных навук, член-карэспандэнт Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Выпускнік геаграфічнага факультэта БДУ, загадчык лабараторыі геахіміі гіпергенезу Інстытута геахіміі і геафізікі АН Беларусі (1972–1998), загадчык кафедры фізічнай геаграфіі СССР (1983–1984) у альма-матар.*

## Галавакружная кар'ера за 13 гадоў

– Мой дзед, Канстанцін Ігнатавіч, родам з вёскі Гарадзец, што за 16 кіламетраў на захад ад Быхава. Мой прадзед па бацькоўскай лініі меў традыцыйную сялянскую гаспадарку, але пры гэтым разумеў: сын Косця незвычайны – у яго можа і павінен быць іншы лёс. Першапачатковую адукацыю, як сцвярджаюць магілёўскія краязнаўцы, Канстанцін Ігнатавіч атрымаў у мясцовага яўрэя, затым, пасля заканчэння Гарадзецкага народнага вучылішча, працягнуў у Быхаўскай працоўнай сямігадовай школе.

На жаль, пры жыцці дзеда я не скарыстаўся магчымасцю даведацца падрабязнасці яго біяграфіі ад яго самога. Ён пайшоў з жыцця, калі мне было 27 гадоў. Зрэшты, для многіх сур'ёзных пытанняў нават тады я быў занадта малады. Многае пра дзеда я чуў пазней ужо ад свайго бацькі Валянціна Канстанцінавіча, які ў апошнія гады жыцця пачаў працаваць над біяграфіяй Канстанціна Ігнатавіча.

Тым не менш з гісторыяй яго жыцця цяпер я знаёмы вельмі добра, бо дастаткова даўно займаюся ёю як «адцягненай навуковай праблемай» (у перспектыве плануецца выданне вялікай манаграфіі), бо гэты ўнікальны чалавек істотна паўплываў на нашу сям'ю і выбар шляхоў яе прафесійнага развіцця, гісторыю нашай радзімы.

У 1923 годзе Канстанцін Ігнатавіч стаў камсамольцам, у 1927 годзе ўвайшоў у ВКП(б). Цяпер бы сказалі, што гэта былі цудоўныя сацыяльныя лесвіцы для актыўных маладых людзей. Паколькі Быхаў у 1919–1924 гадах знаходзіўся на тэрыторыі РСФСР, то самую таленавітую і актыўную моладзь працягвалі адпраўляць вучыцца не ў Мінск, а ў Ленінград ці Маскву. У 1927 годзе Канстанцін Ігнатавіч быў адкамандзіраваны на вучобу ў Ленінградскі ўніверсітэт, дзе яму ўдалося зрабіць незвычайную кар'еру: за 13 гадоў ён «вырас» ад простага студэнта-першакурсніка глебава-геалагічнага факультэта да дырэктара (так тады называлася пасада рэктара) Ленінградскага ўніверсітэта.

У 1933 годзе Канстанцін Ігнатавіч апублікаваў кнігу «Грунтазнаўства», якая стала першым падручнікам па гэтай дысцыпліне ў СССР. Варта нагадаць, што ў царскай Расіі было вельмі мала абсталяваных (у сучасным паняцці) дарог, і да пачатку 30-х гадоў гэтая праблема была тормазам для наступнага развіцця СССР. У 1932–1935 гг. Канстанцін Ігнатавіч у якасці начальніка партыі, затым намесніка навуковага кіраўніка па мярзлотным даследаванні ўздзельнічаў у інжынерна-геалагічных даследаваннях трасы Байкала-Амурскай магістралі, дзе ўнёс важкі ўклад у развіццё грунтазнаўства.

Ён стварыў новы навуковы напрамак – генетычнае грунтазнаўства, асноўныя палажэнні якога былі сфармуляваны ў манаграфіях «Элементы генетычнага грунтазнаўства» (1938) і «Грунты СССР» (1939). Вялікае значэнне для інжынерна-геалагічных даследаванняў і будаўніцтва ў зоне вечнай мерзлаты мела таксама яго праца «Вобласць вечнай мерзлаты як асаблівая фізіка-геаграфічная і будаўнічая вобласць» (1938). На аснове даследаванняў, праведзеных у Амурскім краі, Канстанцін Ігнатавіч у 1937 годзе абараніў доктарскую дысертацыю.

## 5 гадоў «Вялікай ваеннай эпохі»

Пры асабістых зносінах з Канстанцінам Ігнатавічам адчувалася, што ён быў чалавекам эліты сталінскай эпохі. Не цярпеў лішніх слоў, не казаў пра рэчы, за якія не мог ручацца, быў вельмі пунктуальны, карэктны і дыпламатычны. Паводзіў сябе заўсёды падкрэслена інтэлігентна, ведаў англійскую і французскую мовы і ўмеў па-асабліваму («па-амерыканску») усміхацца. Па сутнасці, ён быў, як тады казалі, «вылучэнцам» – чалавекам, які паказаў прыродажаныя выдатныя здольнасці, і ў выніку гэтага заўважаным і ўзнятым уладай на адказныя пасады ў зусім іншай сферы дзейнасці. У 1939 годзе ўрад СССР накіраваў Канстанціна Ігнатавіча ў Нью-Ёрк у якасці прэзідэнта «Амгандлю». Гэтае акцыянернае таварыства выступала пасярэднікам пры правядзенні экспартна-імпартных аперацый паміж савецкімі і амерыканскімі кампаніямі. Папярэднікі Канстанціна Ігнатавіча на гэтай пасадзе, вядома, былі яркімі людзьмі, але ў той час на чале «Амгандлю» павінен быў стаяць чалавек навукі, прафесар, які зможа сістэмна вывучыць і з размахам асвоіць рынак ЗША.

Па сутнасці, пяцігадовы перыяд яго працы (1939–1944 гады), у тым ліку ў якасці намесніка старшыні ўрадавай закупачнай камісіі СССР у ЗША, можна было назваць «Вялікай ваеннай эпохай». Гэта сапраўды бязмежная тэма, пра якую, нарэшце, у нас сталі з'яўляцца сур'ёзныя акадэмічныя даследаванні. Вельмі рэкамендую азнаёміцца з манаграфіямі Н. Бутэнінай «Ленд-ліз: здзелка стагоддзя» (2004) і І. У. Быстровай «Ленд-ліз для СССР: Эканоміка, тэхніка, людзі (1941–1945 гг.)» (2019), а таксама з кнігай А. Х. Папёрна «Ленд-ліз. Ціхі акіян» (1998). Праз рукі Канстанціна Ігнатавіча і яго супрацоўнікаў прайшла ваенная дапамога СССР на суму 9,8 млрд долараў, што перавышае 100 млрд долараў у сучасных коштах.

Для арганізацыі паставак па ленд-лізе Канстанціну Ігнатавічу даводзілася напрамую звяртацца да фірмаў і асабіста раз'язджаць па ЗША, часта лётаць на самалёце. У гонар незвычайнага рэкорднага налёту кіламетраў амерыканская авіякампанія нават выдала яму своеасаблівы ганаровы дыпломсертыфікат. Дэталёвае веданне амерыканскага рынку дазваляла Канстанціну Ігнатавічу павялічваць аб'ёмы запланаваных паставак, нягледзячы на тое, што на дакументах, якія вызначаюць іх колькасць, ужо стаяў подпіс самога І. В. Сталіна. Аднойчы ён атрымаў тэлеграму ад Сталіна , у якой «тав. Лукашова» вельмі ветліва прасілі так больш не рабіць.

Канешне, у гады вайны было не да адпачынку. Толькі пасля 1943 года, калі перамога СССР ужо не выклікала сумневаў, Канстанцін Ігнатавіч стаў дазваляць сабе некаторыя паслабленні. Мой бацька ўспамінаў паездку на выхадныя на мора, праезд на машыне па дарогах суседняга з акругай Калумбія штата. Варта таксама адзначыць, што Канстанцін Ігнатавіч валодаў ад прыроды ўменнем у патрэбны момант, як ён казаў, выкінуць усё з галавы і хутка заснуць як увечары, так і ўдзень, калі гэта ўдавалася. Таму ён здолеў захаваць сваё душэўнае здароўе да глыбокай старасці.

Нягледзячы на занятасць справамі «Амгандлю» і ўрадавай закупачнай камісіі, Канстанцін Ігнатавіч у вольны час працягваў займацца навукай. У мяне ў хатнім архіве мецца пераплеценая кніга, надрукаваная кімсьці з яго атачэння на англійскай мове. У ёй змяшчаюцца навуковыя ідэі, якія Канстанцін Ігнатавіч развіваў у далейшым у цыкле манаграфій, прысвечаных корам выветрывання і геахіміі зоны гіпергенезу.

Наогул, стыль працы Канстанціна Ігнатавіча коратка можна апісаць так: неабходна ўстаць а 6-й раніцы і перад працай напісаць адну старонку будучай кнігі, у выніку праз год у актыве будзе рукапіс у 300-350 старонак. Пісаць адну навуковую кнігу многія гады бессэнсоўна, бо пры сучасных тэмпах развіцця навукі, яна ўсё роўна хутка часткова састарэе. Лепш праз 5 гадоў вярнуцца да гэтай тэмы і стварыць новую кнігу. Дзякуючы такому падыходу ён напісаў каля 50 кніг і быў бы першым у беларускай навуковай «Кнізе рэкордаў Гінэса», калі б такая існавала. Паколькі ў тую эпоху навуковая інфармацыя была прадстаўлена ў асноўным у папяровай форме, у Канстанціна Ігнатавіча былі памочнікі – сакратары-рэферэнты, якія накіроўваліся ў навуковыя бібліятэкі і рэферыравалі названыя ім матэрыялы (артыкулы, манаграфіі і інш.). Аб'ём перапрацаванай інфармацыі быў такі, што некаторыя з гэтых аплатных работнікаў нават падрыхтавалі і абаранілі ўласныя кандыдацкія дысертацыі.

## «Дарожная карта» развіцця для кожнага нашчадка

Зыходзячы з вопыту сваёй навуковай і дзелавой кар'еры, Канстанцін Ігнатавіч відавочна лічыў, што дзяцей як мага раней трэба дапамагаць выбіраць напрамак для развіцця і займацца яны павінны прыродазнаўчымі навукамі. Так, яго сын Валянцін Канстанцінавіч у 22 гады апублікаваў свой першы артыкул у Дакладах акадэміі навук БССР, у 25 гадоў абараніў кандыдацкую, а ў 31 – доктарскую дысертацыі, стаўшы, такім чынам, самым маладым доктарам геолага-мінералагічных навук у тагачаснай Беларускай ССР. Навукоўцам стала і дачка Канстанціна Ігнатавіча Ірына – кандыдат біялагічных навук, суаўтар шматлікіх кніг Канстанціна Ігнатавіча, прысвечаных праблемам біясферы.

Я нарадзіўся 24 чэрвеня 1960 года. У мяне яшчэ імя не было ў той дзень, але я ўжо атрымаў ад Канстанціна Ігнатавіча тэлеграму, у якой было сказана: «Віншую з нараджэннем прадаўжальніка выдатнай навукі геахіміі». У 10 гадоў было вырашана, што мне трэба пачынаць ездзіць з бацькам у экспедыцыі: беларускае Палессе, Прыбалтыка, Урал, Малдавія, Паўднёвае Забайкалле і г. д. Мне падарылі пікетажку, у якой я рабіў замалёўкі шурфаў, агаленняў і вёў экспедыцыйны дзённік. Ужо ў дарослым узросце, прагладаючы гэты «гістарычны» дакумент, я зразумеў, што ў дзяцінстве ўдзельнічаў (хутчэй, «прысутнічаў») у шматлікіх важных экспедыцыях, матэрыялы якіх былі пакладзены ў аснову шэрагу галоўных навуковых кніг майго бацькі. У 1977 годзе я паступіў на геаграфічны факультэт БДУ, пасля заканчэння якога ў 1982 годзе 18 гадоў працаваў у Інстытуце геахіміі і геафізікі.

У 1985 годзе Канстанцін Ігнатавіч вырашыў, што мне можна даверыць напісанне главы пра Беларусь у яго новай кнізе «Тэхнагенез і геахімічныя змены ў навакольным асяроддзі». Я легкадумна пагадзіўся, пра што вельмі хутка моцна пашкадаваў. Праз тыдзень мяне спыталі, як ідуць справы, а я яшчэ нават і не пачынаў. Затым адбывалася наступнае: Канстанцін Ігнатавіч кожны дзень тэлефанаваў мне а 7-й раніцы і цікавіўся, што я напісаў ноччу пасля працы ў інстытуцкай аналітычнай лабараторыі (гэта ніхто не адмяняў). Яму было лёгка працаваць над сваімі кнігамі, паколькі ў яго было мноства напрацовак мінулых гадоў. Мне ж даводзілася разбірацца з тады яшчэ зусім не асвоенай тэматыкай, пры гэтым матэрыялы былі ў самых лепшых традыцыях у асноўным паўзасакрэчаныя. У выніку за месяц я напісаў раздзел, толькі потым імкнуўся трымацца ад тэлефона і залішне дзелавога Канстанціна Ігнатавіча як мага далей. Шчыра кажучы, многія гады мне гэтая кніга чамусьці здавалася не вельмі ўдалай, пакуль, на маё шчырае здзіўленне, у 2007 г. заслужаны дзеяч навукі РФ прафесар Л. П. Рыхванаў на святкаванні 100-годдзя з дня нараджэння К. І. Лукашова абвясціў у сваім дакладзе, што дадзеная манаграфія яшчэ ў 80-я гады кардынальна паўплывала на яго навуковыя інтарэсы, якія зрушыліся ў бок геаэкалогіі.

Пакуль былі жывыя старэйшыя Лукашовы, я спрабаваў многія напрамкі ўласнага развіцця – літаратуразнаўства, музыказнаўства, прафесійная кампазітарская музыка і інш. Аднак пасля смерці майго бацькі ў 1998 годзе і пераходу на працу ў БДУ я, натуральна, быў абавязаны скансэнтравацца на працягу сямейных традыцый «дынастыі Лукашовых». Праз чвэрць стагоддзя магу сказаць, што ў мяне гэта, відаць, атрымалася – універсітэт, памножаны на акадэмічную грунтоўнасць, далі мне для гэтага велізарныя магчымасці: чытанне ў розныя гады больш за 20 прадметаў для сотняў маладых геолагаў (фактычна, я сам атрымаў другую геалагічную адукацыю); выкананне шматлікіх эколага-геахімічных навукова-даследчых і гаспадарчых дамоўных работ з раней недаступным размахам; падрыхтоўка двух кандыдатаў геаграфічных навук; кіраўніцтва СНДЛ «Рэгіянальная геалогія, геахімія і геафізіка»; кіраўніцтва кафедрай рэгіянальнай геалогіі; распрацоўка стандартаў, тыпавых планаў; арганізацыя міжнародных навуковых канферэнцый і шматлікае іншае.

Увосень 2022 года на факультэце геаграфіі і геаінфарматыкі пройдзе міжнародная навуковая канферэнцыя, прысвечаная 115-годдзю з дня нараджэння акадэміка К. І. Лукашова, прыходзьце – пачуеце шмат новага і цікавага.

**Марыя ШНА**

УНІВЕРСІТЭТ
1 ліпеня 2022 года, № 9 (2260)

# Кіно на прыродзе

**З 27 па 29 мая прайшоў XIII студэнцкі турыстычны злёт БРСМ БДУ «Высокі бераг–2022». Яго ўдзельнікамі сталі больш за 200 студэнтаў, аб'яднаных у 14 каманд.**




Назва турзлёту цалкам адлюстроўвала тэму мерапрыемства – «XIII з'езд кінематаграфістаў». Кожная каманда праз жараб'ёўку атрымлівала адзін фільм з савецкага кінематографу, які павінна была прадставіць на з'ездзе. Студэнтам трэба было выканаць некалькі дамашніх заданняў – падрыхтаваць візітоўку, відэа, фота і творчы нумар. Фота і відэапрадстаўленні выкладалі ў групе мерапрыемства «Укантакце» на працягу дзесяці дзён. Крэатыўны падыход моладзі да гэтага конкурсу журы ацэньвала асобна. Намінацыю за найлепшае відэа атрымала каманда **гістарычнага факультэта** з іх нуарнай інтэрпрэтацыяй знаёмага ўсім мультфільма «Ну, пачакай!». А ўзнагароду за самае лепшае фота паводле мультфільма «Маляня і Карлсан» заваявала каманда **фізічнага факультэта**.

Праходзіў злёт у комплексе «Высокі бераг» Стаўбцоўскага раёна Мінскай вобласці. Арганізатары адзначылі, што акцыя накіравана на захаванне і развіццё традыцый універсітэцкага жыцця, студэнцкага турысцкага руху і ўмацаванне здароўя маладога пакалення.

У першы дзень на адкрыцці турзлёту студэнты прадставілі свае каманды з дапамогай візітовак, якія падрыхтавалі раней, і арганізавалі палатачны лагер. Для многіх злёт быў першым турыстычным досведам, таму ім даводзілася шмат чаму вучыцца з нуля, у тым ліку як ставіць палатку і разводзіць вогнішча.

Пераможцамі ў конкурсе візітовак сталі навучэнцы **эканамічнага факультэта** – каманда нібыта прыехала з вёскі «Прастаквашына».

Акрамя таго, удзельнікам прапанавалі конкурс на тэматычныя дэкарацыі палатак у тэматыцы зададзенага фільма. З гэтым лепш за ўсіх справілася каманда біялагічнага факультэта, чый лагер быў упрыгожаны ў стылістыцы фільма «Службовы раман». Акрамя таго, можна было пахадзіць па вуліцах Масквы, якая не верыць слязам, праспяваць з брэменскімі музыкамі, пабываць на вяселлі ў Малінаўцы.

Каманды дэманстравалі свае стралковыя навыкі ў ваенна-тактычнай гульні «Лазертаг». Сапраўднымі байцамі паказалі сябе студэнты з каманды **юрыдычнага факультэта**. Пасля такой актыўнасці студэнтаў чакалі ўтульны вечар ля вогнішча і конкурс песень ваенных гадоў. На ім вылучыўся **ваенны факультэт**.

На другі дзень было запланавана шмат спартыўных конкурсаў. Па-першае, паласа перашкод. На канатнай дарозе трэба было пераадолець 3 выпрабаванні: прайсці па прамой, балансуючы на вяроўках, правільна перачапіць тросы і на страхоўцы прапаўзці па канаце. Усё гэта трэба было зрабіць як мага хутчэй. З улікам правільнасці выканання іспытаў і хуткасці ў гэтым спаборніцтве перамагла каманда **юрыдычнага каледжа**.

– Паласа перашкод мела вельмі эпічную назву – «Паласа выжывання». Яна была даволі цікавая і ўсім спадабалася. Многім нават хацелася прайсці яшчэ раз, – расказвае ўдзельнік каманды фізічнага факультэта **Антон УЛАНАЎ**.

З надвор'ем у гэтыя тры дні не вельмі пашанцавала: было дажджліва, таму часта студэнтам дапамагалі ратавацца парасоны і дажджавікі. На жаль, арганізатарам прыйшлося адмяніць спартыўнае арыентаванне. Але мокры пясок не перашкодзіў правесці спаборніцтва па валейболе.

– Нашай камандзе пашанцавала, мы па выніках жараб'ёўкі былі трэцімі і яшчэ паспелі пагуляць, калі было сонечна. Валейбол мне ўвогуле больш за ўсё запомніўся. Мы падтрымлівалі адзін аднаго за любое ачко, было вельмі весела, і, нягледзячы на тое, што гэта спаборніцтва, з супернікамі ў нас былі добрыя ўзаемаадносіны, – распавядае капітан каманды факультэта журналістыкі **Анастасія ПОЎХ.**

Пасля такіх актыўных спаборніцтваў праходзіў агляд палатачных лагераў і конкурс паходных страў «Каша-Battle». Студэнты імкнуліся крэатыўна падысці да гэтага смачнага конкурсу, таму ў той дзень можна было пакаштаваць і салодкую кашу з варэннем Карлсана, і даволі экзатычны варыянт паходнай кашы, падобнай да кітайскіх страў.

– У нас была перавага – замежныя студэнт, які падзяліўся рэцэптам са сваёй радзімы. Некаторым было страшна каштаваць нашу салёную кітайскую кашу. Для беларусаў яна вельмі спецыфічная, таму што гатуецца з мукі, памідора, агурка, соевага соўсу, а не з круп. Але тыя, хто ўсё ж такі адважыўся пакаштаваць, здзіўляліся цікаваму смаку, – расказала ўдзельніца каманды журфака **Дар'я ЛЕАНОВІЧ**.

Але, на думку журы, найлепшую кашу турзлёту зварылі студэнты **хімічнага факультэта**. «Нахімічылі», – жартуюць студэнты з іншых каманд і адзначаюць, што хімфак гэту намінацыю сапраўды заслужыў.

Кульмінацыяй дня сталі творчыя нумары, да якіх студэнты-турысты рыхтаваліся даўжэй за ўсё. На сцэне яны паказвалі тэатральныя нумары, жартавалі, спявалі песні. Зоркамі канцэрта, адзначанымі намінацыяй, сталі «Брэменскія музыканты» з **філалагічнага факультэта**. Студэнтка **Дар'я ШАНЧУК** з гэтай каманды нават атрымала прыз за «Найлепшую жаночую ролю». А сярод хлопцаў адпаведная дасталася **Аляксандру ЯРМОЛІЧУ** з **юрыдычнага каледжа.**

Вечары на прыродзе халодныя, таму пасля конкурсаў студэнты ўсе разам танцавалі пад кавер-бэнд на ўтульнай імправізаванай танцпляцоўцы.

– Нягледзячы на тое, што мы кожны дзень спаборнічалі, не абыходзілася і без традыцыйных рамантычных атрыбутаў: па вечарах гатавалі на вогнішчы вячэру, спявалі песні пад гітару, чыталі вершы. Мусіць, менавіта гэтыя моманты запалі ў душу больш за ўсё, таму што ў іх была асаблівая атмасфера, – дзеліцца эмоцыямі Анастасія Поўх.

Некаторыя студэнты не былі гатовыя сутыкнуцца з суровымі ўмовамі жыцця ў палатачным лагеры. Але на турзлёце былі і дасведчаныя турысты, якія дапамагалі навічкам. Працавалі ўсе на роўных. Турысты разам гатавалі стравы ў казане, насілі ваду (набраць яе было можна на тэрыторыі комплексу), мылі посуд. Але, як звычайна, юнакі часцей адказвалі за распальванне вогнішча і нарыхтоўку дроў.

– Я езджу ў паходы з татам з самага дзяцінства, і гэта вельмі весела – жыць у палатках, гатаваць на вогнішчы, сядзець ля агню і спяваць разам. Не кожны можа жыць у палатцы, калі холадна. Трэба грэцца, класціся побач у спальных мяшках, каб не мёрзнуць, апранаць на сябе па два-тры камплекты цёплага адзення. Але весці актыўны лад жыцця – крута, – дзеліцца сваім досведам удзельнік каманды журфака **Дзмітрый ЯНУШКЕВІЧ**.

У такіх жорсткіх умовах галоўным фактарам «выжывання» становіцца ўзаемадапамога. І, па расповедах юнакоў і дзяўчат, з ёй праблем не было.

– Памятаю, прачнулася а 5 раніцы ад таго, што вельмі змерзла. Не ведала, што рабіць. Але мяне пабачылі ўдзельнікі каманды ваеннага факультэта і прапанавалі пасядзець і пагрэцца каля іх вогнішча. Надвор'е падчас нашага злёту было кепскае, было вельмі сыра і холадна, але можна было не перажываць за тое, каб знайсці цёплы куток і паесці, – дзеліцца ўспамінамі студэнтка з каманды факультэта журналістыкі **Лізавета АРЛОВА**. – Вольнага часу не было шмат, але яго праводзілі разам. Спявалі ля вогнішча, размаўлялі, атрымлівалі асалоду ад мясцовых краявідаў.

Заключны дзень быў прысвечаны воднаму спорту. Студэнтаў чакала апошняе спаборніцтва, якое вызначыла пераможцаў турыстычнага злёту – сплаў па рацэ на байдарках. Каманды павінны былі на хуткасць пераправіцца па Нёмане з аднаго берага на іншы. Найлепшымі сталі студэнты каманды ФФСН.

Пасля гэтага моладзь збірала палатачныя лагеры і чакала ўрачыстага завяршэння з абвяшчэннем пераможцаў.

Па выніках усіх выпрабаванняў першае месца заняла каманда юрыдычнага каледжа, якая прадстаўляла адну з культавых кінакамедый савецкага кінематографу – «Брыльянтавая рука».

Другое месца заняла каманда хімічнага факультэта, іх фільм – «Аперацыя "Ы" і іншыя прыгоды Шурыка». Трэцяе месца ў каманды факультэта філасофіі і сацыяльных навук, яны паказалі сучасную інтэрпрэтацыю фільма «Дзяўчаты».

Без намінацый не застаўся ніхто. Адмысловы прыз у намінацыі «Ціхія ночы» атрымала каманда факультэта журналістыкі, якая прадстаўляла фільм «Масква слязам не верыць». Арганізатары адзначылі, што ў турыстычных умовах дысцыпліна і парадак вельмі важныя, і ў гэтым журналісты вызначыліся лепш за іншых. А «самай яркай камандай» сталі навучэнцы факультэта геаграфіі і геаінфарматыкі з іх прадстаўленнем рамантычнай камедыі «Каханне і галубы».

Кожны студэнт, які пабываў на XIII студэнцкім турыстычным злёце БРСМ БДУ «Высокі бераг–2022», забраў з сабой багата прыемных і вясёлых успамінаў, уражанняў і, канешне, новых уменняў. Усе як адзін кажуць, што турзлёт – тое мерапрыемства, на якім абавязкова трэба пабываць, каб выпрабаваць сябе.

**Ганна КАЗАКОВА**

УНІВЕРСІТЭТ
Выдаецца з 1929 года

Заснавальнік газеты – Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт
Выданне зарэгістравана Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.
Рэгістрацыйнае пасведчанне № 1082 ад 21 студзеня 2010 года

Падпісана да друку 01.07.2022 г.
Зак. 611. Тыраж 1000 экз.
Надрукавана на Дзяржаўным прадпрыемстве «БудМедыяПраект».
ЛП № 02330/71 ад 23.01.2014 220123, Мінск, вул. В. Харужай, 13/61.

**Рэдактар Дар'я Аляксандраўна ШУПЕНЬКА**
Карэктар Ганна Яўгенаўна РАК
Адрас рэдакцыі: 220004, г. Мінск, вул. Кальварыйская, 9, каб. 804, 802, тэл. 259-70-77, 259-70-65
*e-mail: gazeta@bsu.by; www.gazeta.bsu.by*